УДК 821.161.3:378.016

# МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТ ПРАЦЫ З КАНЦЭПТАМ *ДОМ* ПРЫ ВЫВУЧЭННІ СТУДЭНТАМІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Пучынская Таццяна Міхайлаўна**
загадчык кафедры філалогіі
ўстановы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»;
кандыдат педагагічных навук, дацэнт
(г. Баранавічы, Беларусь)

Адной з асноўных мэт прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры з’яўляецца фарміраванне культуралагічнай кампетэнтнасці. Важна, каб настаўнік літаратуры ўмеў аналізаваць тэкст як інтэртэкст, у сукупнасці розных культурных знакаў. Вывучэнне студэнтамі беларускай літаратуры на аснове канцэпту адкрывае значныя магчымасці для аналізу твора як факта нацыянальнай культуры. Метадычная інтэрпрэтацыя канцэпту прадстаўлена ў галіне методык выкладання рускай мовы (Л. А. Хадзякова, З. А. Ахметжанава) [1] і літаратуры (Л. А. Ізмайлава) [2]. Канцэпт прэзентуецца як «новая катэгорыя методыкі выкладання літаратуры», «эфектыўны метадычны інструмент пры аналізе літаратурнага твора», «адзінка аналізу твора», «інавацыйны метад навучання» (Л. А. Ізмайлава). Вывучэнне твораў на аснове



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

працы з канцэптамі актуальнае, на наш погляд, і ў дачыненні да выкладання беларускай літаратуры ў вышэйшай школе. Для фарміравання інтэгратыўных ведаў студэнтаў важна высветліць агульнае, «базавае» значэнне канцэпту («культурны» канцэпт). Для гэтага неабходна звярнуцца да спецыяльнай навуковай і энцыклапедычнай літаратуры, слоўнікаў. Выяўленне каштоўнаснага зместу твораў адбываецца на аснове працы з «мастацкім» канцэптам. Гэта «інструмент аналізу тэксту, які раскрывае канцэптуальна-вобразную аснову мастацкага твора праз мадэляванне ў ім інтэртэкстуальнага (на ўзроўні твора і мастацкай карціны аўтара ў цэлым) і агульнакультурнага значэння канцэпту (параўнанне твораў розных аўтараў у межах пэўнага канцэпту)» [2].

Адзін з ключавых канцэптаў у беларускай канцэптасферы – *дом*. Яго нацыянальная спецыфіка яскрава праяўляецца ў культуры, звычаях, міфалогіі і літаратуры беларусаў. Традыцыйным беларускім домам з'яўляецца хата, якая ў народнай аксіялогіі паўстае як сімвал найвялікшай каштоўнасці: «Свая хатка як родная матка». Канцэпт *дом* мае перш за ўсё прасторавы, «тапалагічны» сэнс, паколькі хата аддзяляе чалавека ад навакольнага свету. Канцэпт *дом* (*хата*) сустракаецца ў творах беларускіх пісьменнікаў даволі часта і сімвалізуе Радзіму, заможнае, шчаслівае жыццё чалавека. Веданне студэнтамі агульнакультурнага значэння канцэпту *дом* дапамагае ўбачыць яго мастацкі змест. Студэнтам прапануецца, напрыклад, наступнае заданне даследчага характару: «Вызначце "базавае" значэнне канцэпту *дом* паводле слоўнікаў і энцыклапедый. Ці супадае яно з мастацкай карцінай свету аўтара (Я. Купалы)?». Студэнты заўважаюць, што, пачынаючы з драмы Я. Купалы «Раскіданае гняздо», змест канцэпту *дом* пашыраецца, узнікае дадатковае, мастацкае значэнне — «сімвал краху, няшчасця». Разбурэнне хаты Зяблікаў успрымаецца як жыццёвая катастрофа, за якой бачыцца драма Беларусі.

Матыўная лінія канцэпту *дом* – «раскіданае» гняздо – у разнастайных варыяцыях паўтараецца не толькі ў класічнай, але і ў сучаснай літаратуры. Эфектыўным прыёмам навучання ў дадзенай сітуацыі з'яўляецца параўнанне твораў. Арганізуецца праца з аповесцю В. Быкава «Знак бяды», студэнтам прапануецца параўнаць лёс сядзібы Багацькаў і хаты Зяблікаў. В. Быкаў паказвае іншыя ў параўнанні з Я. Купалам гістарычныя абставіны. Вынікі жыццёвых калізій, аднак, нагадваюць ідэйны змест драмы Я. Купалы. Сядзіба Багацькаў таксама, як і хата Зяблікаў, знішчана. Разбурэнне сялянскай хаты ў В. Быкава і Я. Купалы ўспрымаецца як трагічнае наканаванне лёсу не толькі асобнай сям'і, але і народа ў цэлым [3]. Страта бацькоўскага дому ў час нялёгкіх гістарычных выпрабаванняў асэнсоўваецца сучаснымі пісьменнікамі. Вобраз хаты, якую неабходна адстаяць, прысутнічае ў драме У. Бутрамеева «Страсці па Аўдзею». Праяўляючы сапраўдную волю да жыцця, галоўны герой абараняе сваю сям'ю, гаспадарку, дом.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Для больш глыбокага ўспрымання студэнтамі твораў можна звярнуцца да прыёмаў навучання, якія развіваюць эмацыянальную чуйнасць. Прапануюцца наступныя вучэбныя сітуацыі, пытанні і заданні: «Паспрабуйце ўявіць і "запісаць" думкі (унутраны маналог) селяніна Аўдзея ў той момант, калі ён губляе хату і нажытую цяжкай працай гаспадарку». Наступнае заданне: «Апішыце пачуцці героя, не называючы яго імя». Студэнты павінны пазнаць дзеючую асобу па пачуццях. Яшчэ адзін варыянт працы: «Словамі перадайце міміку, жэсты, рысы характару героя, не называючы яго імя і асаблівасці знешнасці». Група атрымлівае заданне пазнаць персанажа. Нарэшце студэнтам прапануецца ўявіць сям'ю Аўдзея ў фінале драмы: «Што вы сказалі б героям, каб суцешыць іх гора?».

Мэта дадзеных вучэбных сітуацый – акцэнтаваць увагу на эмацыянальным кампаненце твора, развіваць асацыяцыі, пачуцці перажывання і суперажывання. Працуючы з канцэптам *дом,* студэнты павінны павінны заўважыць, што ён выяўляе не толькі нацыянальны вобраз свету, але і нацыянальны характар, які пазнаецца па эмацыянальным стане герояў.

У разнастайных мастацкіх творах канцэпт *дом* набывае дадатковыя значэнні. Так, В. Казько ўзбагаціў змест дадзенага канцэпту ў беларускай літаратуры новым значэннем, звярнуўшыся да праблемы «бесхацінства» дзяцей. На аснове ўласнага жыццёвага вопыту ён апісаў дзіцячы дом, які для значнай часткі пасляваеннага пакалення дзяцей стаў родным хатай («Хроніка дзетдомаўскага саду», «Суд у Слабадзе» і інш.). У дакументальным фільме «Знакі лёсу» В. Казько згадвае эпізод са свайго жыцця, калі дзетдомаўцы выратавалі ад пажару хату. Пазней Віктар Апанасавіч набыў вясковую хату, якая стала гасцінным домам не толькі для сям'і В. Казько, дзяцей, унукаў, але і для яго сяброў, пісьменнікаў Н. Гілевіча, В. Быкава, А. Жука, М. Стральцова. У адным з інтэрв'ю В. Казько згадвае, што многія дзетдомаўцы марылі пра тое, каб у дарослым жыцці набыць сваю хату, пасадзіць сад, стварыць уласныя сем'і.

Канцэпт *дом* звязваецца ў творах В. Казько са значэннем 'дынастыя, род', вясковая хата ўключае ў сябе ўсю шматграннасць паняцця Радзіма. Хата — найвялікшая каштоўнасць, гэта сувязь з сям'ёй, продкамі, Радзімай. У якасці падагульнення па творчасці В. Казько студэнтам даецца заданне напісаць эсэ на тэму «Каштоўнасць бацькоўскага дому… (паводле твораў В. Казько)». Яно можа быць выканана як на практычных занятках, так і ў межах кіруемай самастойнай работы. Напісанне эсэ па магчымасці дапаўняецца пытаннямі і заданнямі, напрыклад: «Ці ёсць у вас дом (хата, сядзіба і інш.), звязаны з гісторыяй вашай сям'і? Што вы ведаеце пра яго будаўніцтва, жыхароў? Наколькі ён важны для вашай сям'і?». Заданне можа суправаджацца фотаздымкамі, прэзентацыямі і стаць своеасаблівым творчым праектам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Такім чынам, вывучэнне твораў беларускай літаратуры на аснове працы з канцэптамі з'яўляецца, на нашу думку, метадычна апраўданым. Неабходна ўлічваць сучасны стан літаратуразнаўчай навукі ў тэорыі і практыцы навучання студэнтаў. Важна выбіраць метадычны інструментарый, звернуты да праблемы выпрацоўкі асобасных сэнсаў пры вывучэнні твораў. Праца з канцэптам *дом* з'яўляецца адным з прыкладаў звароту да каштоўнасных аспектаў педагагічнай дзейнасці.

**Літаратура**


1. Ахметжанова, З. А. Методическая модель работы с концептом Родина на уроках русского языка в школах с татарским контингентом учащихся / З. А. Ахметжанова : дис. … канд. пед. наук . – М., 2015. – Режим доступа : cdo.mpgu>…uploads/2015/02/ Dissertatsia…1.pdf. – Дата доступа : 12.02.2016.
2. Измайлова Е. А. Изучение художественных концептов на уроках литературы в профильной школе : дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / Е. А. Измайлова. – Санкт-Петербург, 2011. – Режим доступа : lib.hersen.spb>text/izmayilova-ea-akd.pdf. — Дата доступа : 12.02.2016.
3. Матыўная прастора беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя : манагр. / І. В. Жук [і інш.] ; пад агул. рэд. І. В. Жука. – Гродна : ГрДУ, 2009. – 255 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова